# Да ўвагі арганізацый, якія ажыццяўляюць паштовую дзейнасць і дзейнасць у галіне тэлекамунікацый

Арганізацыям усіх формаў уласнасці і іх філіялам, асноўным відам эканамічнай дзейнасці якіх з'яўляецца паштовая дзейнасць і дзейнасць у галіне тэлекамунікацый, якія забяспечылі выкананне паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця, па эканоміі паліўных рэсурсаў, а таксама высокія паказчыкі працоўнай і выканаўчай дысцыпліны **прапануецца прадставіць у Мінсувязі да 1 красавіка 2018 г.** дакументы для вызначэння лепшых арганізацый і адбору прэтэндэнтаў для занясення на Рэспубліканскую дошку Гонару па выніках работы за 2017 год.

Пры накіраванні дакументаў неабходна кіравацца пастановай Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь ад 23 снежня 2016 г. № 20 «Аб зацвярджэнні Інструкцыі аб парадку вызначэння лепшых сярод арганізацый, якія ажыццяўляюць паштовую дзейнасць і дзейнасць у галіне тэлекамунікацый, і іх філіялаў, для занясення на Рэспубліканскую дошку Гонару і аб прызнанні страціўшымі сілу некаторых пастаноў Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь.

Вашай увазе прапануецца інфармацыя аб правілах адбору, умовах і неабходных дакументах для ўдзелу ў вызначэнні лепшых арганізацый, якія ажыццяўляюць паштовую дзейнасць і дзейнасць у галіне тэлекамунікацый і іх філіялаў для занясення на Рэспубліканскую дошку Гонару за дасягненне лепшых паказчыкаў у сферы сацыяльна-эканамічнага развіцця па эканоміі рэсурсаў па выніках работы за 2017 год.

Абавязковыя ўмовы па адборы прэтэндэнтаў
Пералік і тэрмін прадастаўлення матэр'ялаў
Форма даведкі аб выкананні паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця і крытэрыяў ацэнкі работы арганізацыі за 2017 год
Форма даведкі аб выкананні паказчыкаў эканоміі рэсурсаў і крытэрыяў ацэнскі работы арганізацыі за 2017 год

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/11-03-2018-2703*